# ЭНГЕЛЬС ДАРАШЭВІЧ. IN MEMORIA

*Энгельс Дарашэвіч*

**НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА У СТРУКТУРЫ СУЧАСНАЙ КУЛЬТУРЫ**

*У сваім канцэптуальным артыкуле, адрэдагаваным у студзені 2020 г., філосаф Э. Дарашэвіч сцвярджае, што каштоўнасці і дасягненні толькі тэхнагеннай цывілізацыі не здольныя забяспечыць адэкватнае спасціжэнне спадчыны культуры для будучыні чалавецтва. У сувязі з гэтым ён ставіць пытанне аб стварэнні ў Беларусі прадуманай канцэпцыі спазнання, трансляцыі, забеспячэння функцыянавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны.*

*Engels Darashevich*

**INTANGIBLE CULTURAL HERITAGE IN THE STRUCTURE OF MODERN CULTURE**

*Engels Darashevich in this article claims that the intellectual resource of technogenic civilization is not able to provide an adequate assessment of the cultural heritage for the future of humanity. In this regard, he raises the question of creating a well-thought-out concept of cognition, broadcasting and ensuring the functioning of intangible cultural heritage in Belarus.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

У XXI ст. пры агульным націску глабалізацыі ў Беларусі мы яшчэ маем магчымасць назіраць шэраг з'яў культуры мінуўшчыны, якія, нягледзячы на архаічнасць, інсітнасць, мінімалізм па сродках выразнасці і ў нечым, нават, падманлівую немудрагелістасць і прымітывізм, дапамагаюць чалавеку лепш зразумець сваё месца ў сучаснай культуры, сфармуляваць сваё стаўленне да яе. Часам гэтыя з'явы даводзіцца разглядаць дваяка: яны адначасова носьбіты і прагрэсіўнай і рэакцыйнай пераемнасці. Але пры пабудове аптымальнай панарамы «мазаікі» суіснавання розных тыпаў культуры у XXI ст. бясспрэчна, што пытанне нават не ў тым, каб кваліфікаваць той ці іншы факт паводле вышэйпададзенай шкалы. Для прагназавання будучых культурных працэсаў значна важней знайсці найбольш аб'ектыўныя і аптымальныя ацэнкавыя кантэксты.

Культурная спадчына чалавецтва – надзвычай буйное і глыбіннае паняцце. Частка яе занатавана ў пісьмовых дакументах. Гэта – гістарычная культурная спадчына (спадчына пісьмовай традыцыі). Разважанні храністаў і аўтараў летапісаў, творы антычных філосафаў і літаратараў, адміністратыўныя і прававыя нарматывы, гравюры, гербы, мапы і архітэктурныя планы мінулага – буйны складнік нашага светапогляду і грунту сучаснай культуры. Мы звычайна выдатна разумеем іх «літару» (форму), аднак, з разуменнем іх «духу» (зместу) часам бываюць складанасці.

Таму зараз усё большую ўвагу надаюць культурнай спадчыне, якая захавалася «жыўцом», «літара» і «дух» якой перадаваліся спрадвеку вусным шляхам [1, с. 55]. Гаворка ідзе пра т.зв. спадчыну вуснай традыцыі (oral heritage of humanity) ці, як найчасцей гавораць (разумеючы пры гэтым менавіта *непісьмовы*, *вусны* аспект), нематэрыяльную (у рускай транскрыпцыі «неосязаемую») культурную спадчыну (intangible heritage of humanity). Сёння ёсць падставы сцвярджаць, што, нягледзячы на урбанізм і глабалізацыю, у сучасным свеце адначасова існуюць такія з'явы як руралізацыя і традыцыяналізм. Гэта – сведчанне таго, што нематэрыяльная культурная спадчына, яе светапоглядныя асновы настолькі глыбока «ўбудаваны» ў структуру еўрапейскай культуры, што сучасны чалавек не жадае іх губляць і імкнецца захаваць нават у часы татальнага панавання тэхнагеннасці і інфарматызацыі [2, с. 10].

Сёння пры аналізе месца нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў структуры культуры XXI стагоддзя варта прыгадаць асноўныя *канцэпты*, якія датычацца іх узаемадачыненняў. Як вядома, СТРУКТУРА – нейкая базавая перадумова чагосьці, як бы падмурак і рыштаванне разам. СІСТЭМА – пэўнае адзінства элементаў, якія разглядаюцца ў дынаміцы, у развіцці. Структура і сістэма культуры – гэта яе будаўнічы каркас, трымаючыя канструкцыі з устойлівых і дынамічных элементаў. КУЛЬТУРА – агульнапрынятыя ў межах пэўнай супольнасці формы арганізацыі мыслення і паводзін. НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА – руральныя звычаі і абрады, тэхналогіі народных промыслаў, творы і манеры выканання жанраў аўтэнтычнага фальклору, якія існуюць «жыўцом» у побыце этнасу і перадаюцца вусным шляхам.

Храналагічна погляды на гэты прадмет не былі аднолькавымі. У рацыяналістаў сістэма і структура культуры тлумачыліся як вытворныя ад Універсіума ці Соцыума, якія тут вызначаюць структуру і сістэму (у Г. Ф. Гегеля – Абсалютная Ідэя, у І. Г. Фіхтэ – «я», у К. Маркса – спосаб вытворчасці, а ў ім – вытворчыя адносіны).

У XXI ст. рацыяналістычнае тлумачэнне культуры даюць пераважна тыя навукоўцы-культуролагі, якія абапіраюцца перадусім на інфармацыйна-камунікатыўны падыход да культуры (г.зн., на кібернэтыку, інфарматыку, семіётыку, эканоміку і тэхналогіі). Такі падыход у некаторых адносінах вельмі патрэбны, але ён дае ў асноўным залежнасці ад вонкавых фактараў, а ці можна звесці культуру толькі да вытворнага ад іншага?

Лічыцца, што формы культуры – гэта абагульненая сукупная выява яе сутнасных частак (ці элементаў), якія ўтвараюць пэўнае адзінства – мастацтва, рэлігія, мараль, філасофія, навука і іншыя – якія трымаюць у сабе традыцыю, але ў пэўнай ступені залежаць ад гістарычных умоў.

Тып культуры – гэта поўная сукупнасць розных прыкмет духоўнасці, што ўзніклі на глебе гістарычна дадзеных геаграфічных, антрапалагічных, псіхалагічных, гаспадарчых абставін (клімату, прасторы і часу, рэлігіі, псіхалогіі народа і г. д.). Напрыклад, можна гаварыць аб усходнеславянскім тыпе культуры, маючы на ўвазе нешта агульнае для ўсіх усходніх славян (эпічны прастор: раўніны, лясы, стэп, дрэвы як асноўны будаўнічы кампанент, візантыйска-праваслаўнае веравызнанне як першапачатковы хрысціянскі кампанент і г. д.). Тып культуры – вельмі глыбокая якасная дадзенасць народа ці некалькіх блізкіх народаў, нейкі зыходны культуралагічны катэгарыяльны комплекс, але рэальна гістарычна ён мае шмат выяў і ў жыцці народаў і паасобных людзей. І, канечне, розныя выявы, аблічча, праявы залежаць ад Матухны-Гісторыі. У сучасных

тэхнатронных грамадствах зыходны тып культуры можа вельмі моцна трансфармавацца, але недзе ў духоўных вытоках ён застаецца і шмат што вызначае.

Неабходнасць і заканамернасць існавання розных тыпаў культуры прызнаецца большасцю вядучых культуролагаў XX ст. (М. Бердзяеў, О. Шпэнглер, А. Тойнбі і інш.). Трактоўкі рознымі культуролагамі суадносінаў і ўзаемадзеяння тыпаў культуры значна адрозніваюцца адна ад другой. Гэта і для нас адно з самых складаных пытанняў: ці былі некаторыя вельмі старажытныя зыходныя традыцыі (магчыма адна так званая прымардыяльная), ці некалькі зыходных перавязаліся адна з другой, ці адна адыходзіла, а другая (наступная) прыходзіла і г. д. Розныя тэорыі даюць розныя адказы, у дыскусіях нараджаецца ісціна, якая для кожнага прачытваецца і адкрываецца індывідуальна.

Сапраўды, чалавек усведамляе сябе чалавекам дзякуючы таму, што ведае сваю мінуўшчыну, карані сваіх продкаў – тое, адкуль выйшла яго нацыя, сацыяльная група і атачэнне і г. д. Калі ён далучаны да культуры, то валодае пэўнымі *формамі паводзін і мыслення*, якія знітаваны тымі ці іншымі каштоўнасцямі, традыцыямі, нормамі з гістарычнай мінуўшчынай. Большасць з гэтага амаль несвядома перадаецца пры паводзінных міжасабовых побытавых кантактах, перадаецца выключна вусным шляхам. Таму, нематэрыяльная культурная спадчына ў гэтым кантэксце – неад'емны складнік структуры і сістэмы культуры ўвогуле, без якога немагчыма самаўсведамленне чалавека. Менавіта дзякуючы гэтаму культура бытуе ў якасці адмысловай, уласцівай толькі людскому свету непрыроднай рэальнасці.

У сучасным свеце, калі традыцыйныя сувязі распадаюцца асабліва хутка і на змену прыходзяць усё больш абстрактныя формы адносін, што касмапалізуюць людскую свядомасць, надзвычай важна падтрымліваць сувязь чалавека з мінуўшчынай, традыцыямі, не даць згаснуць выпрацаваным гісторыяй пазітыўным гуманным каштоўнасцям. Таму цікавасць да этнаэкалагічнага і этнакультурнага выхавання, пошук шляхоў спалучэння каранёвай этнаэкалогіі і выхаваўчых, і адукацыйных, рэкрэацыйных практык – патрэба часу. Можна сказаць, што сацыякультурная практыка (прынамсі ў Беларусі) тут крочыць наперадзе тэорыі. Напрыклад, напрыканцы XX ст., паралельна з глабалістычнымі тэндэнцыямі ў рэкрэатыўнай сферы акрэсліліся тэндэнцыі да руралізацыі і цікавасці да гістарычнай нацыянальнай архаікі. Мы нечакана сталі сведкамі такіх з'яў сучаснай культуры, заснаваных на ўзорах нематэрыяльнай культурнай спадчыны, як фальклорны рух (з 1960-х гг.), рух гістарычнай рэканструкцыі і постфальклорны рух (з 1990-х). Трэба дадаць, што яны аказаліся даволі ўстойлівымі і схільнымі да самаарганізацыі і, нават, спалучэння з афіцыйнай культурай XXI ст. (мал. 1). Сённяшняя крэатыўная моладзь апранае не толькі панкаўскую і байкерскую джынсавую і скураную ўніформу, але і этнічныя (гістарычныя) касцюмы сваіх продкаў і імкнецца пераняць іх мастацтва і лепшыя культурныя здабыткі. Наколькі заканамерныя і незваротныя такія працэсы – пакажа час, але ігнараваць іх нельга. А задача навукоўцаў-гуманітарыяў Беларусі – іх вывучаць (мал. 2).



Малюнак 1 – Фальклорны рух Беларусі XXI ст.: аўтэнтычны абрад «Куст» (Моладава, 2012) і калядаванне пост-фальклорнага гурта «Страла» (Мінск, 2015), фота Э. Дарашэвіча



Малюнак 2 – Э. Дарашэвіч у экспедыцыі, 2009

Натуральна, што нематэрыяльная культурная спадчына (НКС) Беларусі існуе перадусім у традыцыйнай руральнай (вясковай) культуры, але відавочна, што захавалася яна і ў паводзінах гараджан (у пэўных адаптаваных формах, тыпах, напрыклад – у форме маладзёжнага фальклорнага руху, постфальклору і г. д.) [3, с. 323]. Асобна стаіць феномен праекту «Берагіня» – фактычна, феномен рэгіянальных школ мастацтва вуснай традыцыі Беларусі, канцэптуальна змадэляваных і самаахвярна выпеставаных супольнасцю навукоўцаў-народазнаўцаў, і, фактычна, школ, генетычна дакладна транслюючых структуру НКС краіны скрозь час. І па меркаванні экспертаў ЮНЕСКА, і па маім перакананні, як філосафа, антраполага, гісторыка навукі, менавіта яна – НКС – надае культуры народа адзінства, трывалую грунтоўнасць і аўтэнтычнасць; дзякуючы наяўнасці пераемнасці, адыгрывае ролю факта трансляцыі, сувязі, упарадкавання, суаднясення з базавай структурай актуальнай культуры народа і г. д. Пераемнасць у культуры – шматгранны грамадскі працэс, які падтрымлівае яе паступовае развіццё, абумоўлены канкрэтнымі сацыяльна-эканамічнымі і палітычнымі перадумовамі, а на сучасным этапе таксама і прафесійнай кампетэнтнасцю навуковых супрацоўнікаў (што займаюцца пытаннямі засваення плёну мінуўшчыны), узроўнем планавання, службай інфармацыі і інш.

Трэба адзначыць, што ў распрацоўцы праблематыкі пераемнасці культуры айчынная культуралогія дасягнула пэўных поспехаў [4, с. 313]. Тым не менш, сёння асабліва заўважна, што асэнсаванне пераемнасці паводле ўкаранёнай матрыцы «прагрэсіўны-рэгрэсіўны» не заўжды дастатковае. Аналіз багата якіх падзей мінуўшчыны паводле гэтага тыпу не дапамагае высветліць пытанне, якім чынам даследаваная падзея адбівалася на сацыякультурным працэсе. Тым больш адказнай з'яўляеца місія навукоўцаў-даследчыкаў культурнай (і матэрыяльнай і нематэрыяльнай) спадчыны, а таксама адміністратараў галіны культуры і мастацтваў, якім наканавана (паводле службовых абавязкаў) яе ахоўваць. Менавіта разуменне гэтай адказнасці прымусіла мяне падняцца на абарону справы кафедры этналогіі і фальклору ў 2009–2012 гг., калі шайка непісьменных мярзотнікаў пры падтрымцы ўсходніх спецслужбаў наладзіла спробу рэйдэрскага захопу і вынішчэння



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

этнамастацкай беларускай адукацыі ва ўніверсітэце культуры і мастацтваў. Як паказаў час, мы змагаліся не дарэмна: «атрымаўшы па лапах» ад тагачаснага Міністэрства культуры, суполка-пачвара пачала «кусаць і рваць на кавалкі» сябе саму, і працэс доўжыцца, што не дзіўна, улічваючы інтэлект, кваліфікацыю ды мараль гэтых «культурных дзеячаў». Шэраг фігурантаў тых падзей (ня гледзячы на часова высокія пасады) былі імкліва выціснуты з дзяржаўнай сферы і сацыяльнага жыцця краіны, а частка – яшчэ, без сумніву, знойдзе дастойны сваіх «подзвігаў» лёс. Дзякуючы нашай прынцыповай пазіцыі, сёння, напачатку 2020 г., мы назіраем працэс імклівага афармлення навукова-практычнай школы айчыннай *ужытковай культурнай антрапалогіі* ці яе першага напрамку – *сацыякультурнай антрапалогіі традыцыйнага мастацтва*, якую ўтвараюць вучні нашыя, нашых калег і аднадумцаў (У. Конана, З. Мажэйкі, Т. Варфаламеевай, М. Козенкі, Я. Грыгаровіч, Г. Кутыровай-Чубалі, У. Зяневіча, М. Грынчыка, В. Лабачэўскай, Р. Кавалёвай, А. Боганевай), а таксама іх выпускнікі, якія непасрэдна працуюць з культурнай спадчынай краіны XXI ст.

Вывучэнне асаблівасцей нематэрыяльнай культурнай спадчыны ва ўмовах глабалізацыі, унікальных сваім гістарычным маштабам, інтэнсіўнасцю і глыбінёй уплыву на ўсю культурную творчасць, бясспрэчна, належыць да найважнейшых праблем пераемнасці і культуры. Засваенне культурнага фонду мінуўшчыны сёння характарызуецца тым, што перавагу набываюць не стылявыя і фармальныя рысы мінулай культуры, а яе суцэльнае і ўсебаковае асэнсаванне з той мэтай, каб суб’ект гэтага асэнсавання мог зразумець сябе арганічнай часткай адзінага культурастваральнага руху гісторыі.

Разам з тым рэзка ўздымаецца значэнне спадчыны вуснай традыцыі ў грамадскім жыцці, узрастае роля навуковага асэнсавання спадкаемнасці культуры, расце ўзровень свядомай дзейнасці людзей у засваенні традыцыйных культурных каштоўнасцей. У выніку прымянення сродкаў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі павялічваецца магчымасць расшыфроўкі найбольш глыбінных культурных пластоў мінуўшчыны, цэлых культурных эпох, з’яўляюцца спосабы рэканструкцыі, рэпрадукцыі культурных скарбаў мінуўшчыны.

Ва ўмовах глабалізацыі каштоўнасці і дасягненні толькі тэхнагеннай цывілізацыі, якія б вялікія яны ні былі, не здольныя забяспечыць адэкватнае, усеабдымнае навуковае спасціжэнне спадчыны культуры для выжывання чалавецтва. У сувязі з гэтым сёння асабліва востра паўстае пытанне аб стварэнні ў Беларусі прадуманай канцэпцыі сацыяльных, палітычных, псіхалагічных і культурных умоў спазнання, трансляцыі, забеспячэння ўжытковага (жыццёвага, побытавага) функцыянавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая невынішчальная са структуры яе сучаснай культуры.

**Спіс літаратуры:**


1. Дорошевич, Э. Миф как явление культуры / Энгельс Дорошевич, Павел Мартысюк // Прырода, чалавек, культура : праблемы гармоніі : матэрыялы навук. канф. (Мінск, 25–26.03.2003). – Мінск : БДУК, 2003. – С. 55–63.
2. Итс, Р. Введение в этнографию / Рудольф Итс. – Л. : Изд-во Ленинград. ун-та, 1974. – 160с.
3. Дубавец, С. Вострая брама : беларускі культурны кантэкст на мяжы стагоддзяў / Сяргей Дубавец. – Мінск : РСЭ / РС, 2005. – 519 с.
4. Калацэй, В. Велікодная абраднасць у святле тэорыі камунікацыі: пытанні міжкультурнага кантэксту святаў першай веснавой поўні / Вячаслаў Калацэй // Прырода, чалавек, культура : праблемы гармоніі : матэрыялы навук. канф. (Мінск, 25–26.03.2003). – Мінск : БДУ культуры, 2003. – С. 309–313.



***Вячаслаў Калацэй***


## НАБЛІЖАЮЧЫ ДАЛЁКАЕ: PATRIMONIO INTELLETTUALE ЭНГЕЛЬСА ДАРАШЭВІЧА (*26.10.1931–14.02.2020*)


*У артыкуле структурна прамаляваны абрыс інтэлектуальнай спадчыны доктара філасофскіх навук, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Э. Дарашэвіча. Аўтар адсочвае, якім чынам у розныя часы шэрагам друкаў Э. Дарашэвіч прааналізаваў па этапах, фактычна, асноўныя лініі ўсяго вядомага навуцы «акультуранага» антрапагенеза, а яго тэксты складваюцца ў паслядоўную і цэласную канцэпцыю разумення тыпалогіі культуры Беларусі як стандартнай «хрэстаматыйна-еўрапейскай» краіны ў глабальным кантэксце. Прычым «навігатарам» па антагенезу краіны і яе народа ў часе і прасторы з’яўляецца спадчына вуснай традыцыі яе тытульнага этнасу.*



***Viachaslau Kalatsei***


## APPROACHING DISTANT: PATRIMONIO INTELLETTUALE BY ENGELS DARASHEVICH (*26.10.1931–14.02.2020*)


*The article structurally outlines the intellectual heritage of Ph. D., laureate of the State Prize of Belarus E. Darashevich. The author traces how at different times E. Darashevich analyzed the main lines of all known to science «cultured» anthropogenesis in stages, and his texts form a consistent and holistic concept of understanding the Belarusian culture typology as a standard «European textbook» country in a global context. And they are a «navigator» of the country ontogeny and its people in time and space is the legacy of the oral tradition of its titular ethnos.*


*Ты сделал меня другом тех, кого не знал я прежде. Ты ввел меня в жилища, доселе мне чуждые. Ты приблизил далекое и чужого сделал мне братом. Мне тяжело покидать привычный кров; я забываю, что в новом живет старое и что ты всюду со мной.*

– Рабіндранат Тагор [8, с. 47]

Культуралогія ў далёкія 1990-я гады рабіла першыя і, трэба адзначыць, досыць кульгавыя крокі па постсавецкай акадэмічнай прасторы, аднак мае калегі і калежанкі – студэнты музычнага факультэта Беларускага ўніверсітэта культуры – даволі «роўненька цягнуліся» на лекцыі па ёй а 8-й раніцы ў пятніцу ці ў суботу, бо лектарам быў Энгельс Дарашэвіч. Сам ён заўжды лічыў сябе перадусім дасведчаным і стромкім гісторыкам навукі, мабыць таму ў новай на той час дысцыпліне, якая інтэгратыўна яднала філасофію, гісторыю, сацыялогію, эканамічную тэорыю і мастацтвазнаўства, меўся «нібыта рыба ў вадзе». І мы, пасля тыдня гам і арпеджыа, выканаўчых трэнінгаў і дырыжыравання, разам з прафесарам гіпнатычна танулі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ